редачи. Как писал профессор Уильям Ву, «пресса, ставшая заложницей своих инвесторов, представляет собой свободную прессу не больше, чем пресса, находящаяся в заложниках у правительства. Нет сомнения в том, что большие и даже небольшие университеты способны это понять». Джозеф Пулитцер понял бы это.

## АЛГАРЫТМ ТРАНСФАРМАЦЫІ ЭКАНАМІЧНАГА БЛОКА НА ПЕРШЫМ НАЦЫЯНАЛЬНЫМ КАНАЛЕ БЕЛАРУСКАГА РАДЫЁ (ПАСЛЯ 2000 ГОДА)

**Н. Я. Скараход**

У 2001 годзе была зацверджана другая па ліку праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця незалежнай Беларусі. Праект быў распрацаваны на падставе выканання папярэдняй праграмы і стаў яшчэ больш маштабным і грунтоўным дакументам. І, зразумела, гэта знайшло адлюстраванне на Першым нацыянальным канале Беларускага радыё.

З’явіліся спецыялізаваныя праграмы. Сёння ў структуры інфармацыйнага і грамадска-палітычнага вяшчання выдзяляюцца асобным блокам штодзённыя агляды для дзелавых людзей «Партнёр» і штотыднёвая інфармацыйна-аналітычная праграма «Эканамічны курс». Апошняя закранае практычна такія значныя аспекты эканамічнай палітыкі дзяржавы, як банкаўская сфера, крэдытаванне, інвестыцыі, рынак каштоўных папер, прадпрымальніцтва.

Асноўныя мэты – шырокае інфармацыйнае забеспячэнне рэалізацыі дзяржаўных эканамічных праграм, дэталёвае азнаямленне слухачоў з прыярытэтамі дзяржаўнай палітыкі ў галіне эканомікі і бізнесу, каментарыі ўказаў, пастаноў, дэкрэтаў Прэзідэнта і пастаноў урада ў галіне эканомікі, аналіз эканамічных падзей у краіне і свеце.

Многія інфармацыйныя і аналітычныя праграмы рыхтуюцца сумесна з міністэрствамі і ведамствамі. Праграма «Эканамічны курс» цесна супрацоўнічае з міністэрствам эканомікі. Вынік: пад увагай толькі ў гэтым сезоне былі такія тэмы, як рэфармаванне прадпрыемстваў дзяржаўнай уласнасці, прыватызацыя, новыя правілы арэнды, рамесная дзейнасць, імпартазамяшчэнне, інвестыцыйная дзейнасць, будаўніцтва жылля. Наладжаны сувязі з Нацыяльным банкам, міністэрствам фінансаў. У структуры праграмы – эканамічныя каментарыі, інтэрв’ю, рэпартажы, апытанні, аператыўная хроніка.

Апошнія тэмы, што былі пад увагай экспертаў праграмы, – замежныя інвестыцыі, развіццё прыватнага сектара эканомікі, жаночы бізнес, міжнароднае супрацоўніцтва.

Праекты «Эканамічны курс» і «Партнёр» ў сетцы вяшчання з 2004 года, яны трымаюцца ў рэйтынгу папулярных праграм Беларускага радыё.

Сёння заўважная трансфармацыя такіх праектаў. Напрыклад, што да «Эканамічнага курса» – гэта пошук новых форм падачы матэрыялу, распрацоўка тэм, аналіз фактаў.

Выпуск эканамічных навін «Партнёр» выходзіць 2 разы ў суткі, раніцай і днём. Праект у сетцы вяшчання трэці сезон, і зараз ён патрабуе дасканаласці. Такія кароткія і змястоўныя выпускі па-ранейшаму запатрабаваныя, але патрэбна развіваць новыя формы падачы матэрыялу, рабіць выпускі больш «жывымі», актуальнымі.

Значнае месца займае тэма эканомікі і не ў спецыялізаваных праграмах. Шмат часу даецца такім тэмам у выпусках «Актуальнага мікрафона», «Тэмы дня», сюжэтах у інфармацыйна-аналітычных праграмах «Радыёфакт» і «Пастфактум». Пад увагай карэспандэнтаў Першага нацыянальнага канала – тэмы надзвычай актуальныя сёння: работа народна-гаспадарчага комплексу Беларусі ў новых эканамічных умовах пасля павышэння цэн на энерганосьбіты; экспарт беларускіх тавараў, у прыватнасці, айчыннага цукру; перспектывы ўступлення Беларусі ў Сусветную гандлёвую арганізацыю; інавацыйны і інвестыцыйны патэнцыял дзяржавы. Эканамічная тэматыка заўсёды запатрабаваная. Нават калі пад увагай палітыка, сацыяльнае забеспячэнне, адукацыя, культура, асноўны базіс – эканамічны.

Алгарытм, як тлумачаць слоўнікі, – гэта сукупнасць дзеянняў, правілаў для вырашэння пэўных задач. Задачы ў вяшчання відавочныя – даць слухачу поўную, аб'ектыўную, дакладную інфармацыю, у даным выпадку на эканамічную тэматыку. Што да сукупнасці правілаў, то іх вызначае для сябе кожны сродак масавай інфармацыі, і журналісты імі і кіруюцца ў рабоце пры асвятленні любой тэматыкі.

Такім чынам, алгарытм трансфармацыі дыктуюць сацыяльна-эканамічныя умовы, якія фарміруюцца на дзяржаўным ўзроўні. Гэта ў сваю чаргу знаходзіць адлюстраванне ў праектах Першага нацыянальнага канала Беларускага радыё.

Алгарытм трансфармацыі ў нашым выпадку вызначае яшчэ і ўвага да тэмы на вышэйшым дзяржаўным узроўні. Эканамічныя праграмы, стратэгіі, рашэнні патрабуюць адлюстравання у СМІ. У эфіры Першага нацыянальнага канала Беларускага радыё якраз і можна пачуць вынікі такой работы.